Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў
Стаўбцоўскі раённы выканаўчы камітэт

Культурны імідж Беларусі

РЭГІЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА НАЛІБОЦКАГА КРАЮ І КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА РОДУ ТЫШКЕВІЧАЎ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

XI Тышкевіцкія чытанні

аг. Налібокі, 18 верасня 2026 г.

Зборнік навуковых артыкулаў

Мінск
БДУКМ
2026

ЗМЕСТ

Карчевская Н. В. Историко-культурное наследие – национальное достояние белорусского народа …….. 5

Культурная спадчына роду Тышкевічаў

Смолік А. І. Міфалагізацыя гістарычнай асобы Канстанціна Тышкевіча …….. 9

Суша А. А. Працы «Апісанне Барысаўскага павета» Яўстаха Тышкевіча і «Вілія і яе берагі» Канстанціна Тышкевіча як крыніцы фарміравання гістарычнай памяці і рэгіянальнай ідэнтычнасці беларусаў ……... 14

Граник Е. А. Египет глазами белорусского аристократа: путевые заметки и культурное наследие Михаила Тышкевича …….. 25

Гісторыка-культурная спадчына Налібоцкага краю

Шелупенко Н. Е., Шмирейчик В. Г. Становление и развитие культурных индустрий в Налибокском регионе ……... 34

Соколова О. М. Античность как ресурс постпамяти: рецепция классического наследия в архитектуре Налибокского края ……. 39

Лашук В. А. Аналіз марфатыпаў гістарычных цэнтраў малых гарадоў у кантэксце фарміравання рэгіянальнай ідэнтычнасці (на прыкладзе Валожына і Івянца) …….. 59

Кухто Л. К. Историко-культурное наследие Налибокского края: сверженский фаянс ……... 63

Сухоцкая Т. Ф. Налібоцка-ўрэцкае шкло ў гісторыка-культурнай спадчыне беларускага народа …….. 70

Кнатько Ю. И. Мемориальные ландшафты Столбцовского края: природный аспект формирования коллективной памяти ……. 77

Бамбешка І. І. Вопыт мемарыялізацыі жыцця і дзейнасці Ф. Э. Дзяржынскага музейнымі сродкамі ……. 84

Герасименок В. Д. Сохранение исторической памяти в Республике Беларусь: мемориалы и памятники Первой мировой войны в Налибокском крае …….. 90

Турыстычны патэнцыял і сучасныя практыкі захавання спадчыны

Криштаносова Е. А. Историко-культурный потенциал Налибокского края в контексте туристической деятельности …… 97

Соколовская М. М. Историко-культурное наследие Налибокского края в контексте развития туристической деятельности …….. 102

Матусевіч А. Д. Эскапізм гарадскіх жыхароў як сацыякультурная практыка (на прыкладзе Налібоцкай пушчы) …… 105

Шэметава А. А. Адаптацыйны патэнцыял аграэкатурызму Налібоцкага краю ……. 111

КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА РОДУ ТЫШКЕВІЧАЎ

А. І. Смолік,
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,
г. Мінск

МІФАЛАГІЗАЦЫЯ ГІСТАРЫЧНАЙ АСОБЫ КАНСТАНЦІНА ТЫШКЕВІЧА

У працэсе жыццядзейнасці шматвяковых пакаленняў беларусаў было створана мноства артэфактаў духоўнай матэрыяльнай культуры, а таксама нематэрыяльных праяў народнай творчасці, якія вызначалі асноўны змест іх быцця. Сярод іх годнае месца належыць міфам, легендам і паданням, якія перадаваліся ад пакалення да пакалення і з'яўляліся фактарам згуртавання беларускага народа ў перыяд сацыяльна-палітычных крызісаў і ўзрушэнняў. Знакаміты заходнееўрапескі даследчык міфаў і паданняў М. Эліядэ адзначаў, што падзея альбо персанаж можа быць успрыняты як міф настолькі, наколькі ў ім адлюстроўваецца апісанне нечага ясна акрэсленага, і апісанне гэта ў адзін і той жа час «стваральны», «ілюстратыўны», бо з'яўляецца падмуркам структуры рэчаіснасці, а таксама формай чалавечых паводзін [7, с. 14].

Даследаванне пэўных крыніц сведчыць, што нярэдка персанажы легенд міфалагізаваліся, насамрэч гістарычныя асобы ператвараліся ў герояў, а рэальныя падзеі станавіліся асновай легендарных паданняў. Таму гістарычная афарбоўка паданняў і легенд і міфалагічная абалонка гісторыі ішлі заўсёды разам.

Так адбылося і з графам Канстанцінам Піевічам Тышкевічам і яго сядзібай у Налібокскай пушчы і паўстанцамі (1830). Як вынікае з гістарычных крыніц паўстаннем была ахоплена значная беларуская тэрыторыя, у тым ліку Налібокскі край. На ўзнікненне грамадскага шляхецкага руху паўплывалі рэвалюцыі ў Заходняй Еўропе (1820) і паўстанне дзекабрыстаў у Расіі (1825). У Варшаве пачалося паўстанне (1830–1831), якое ахапіла значную частку зямель Беларусі, Літвы і Украіны. Найболь-

шая колькасць удзельнікаў паўстання была ў Ашмянскім, Барысаўскім, Віленскім, Дзісенскім і Свянцянскім паветах і інш. [3].

Паўстанцаў, як сведчаць гістарычныя крыніцы, падтрымліваў прадстаўнік старажытнага графскага роду Канстанцін Піевіч Тышкевіч. Тытулы мелі далёка не ўсе феадальныя магнаты, бо іх атрымлівалі ў XVI ст. ад германскіх імператараў і каралёў польскіх. За пэўныя заслугі тытул графа быў нададзены Юрыю Ільнічу, Яну Хадкевічу, Мікалаю Радзівілу і Льву Сапегу, а ў 1569 г. – Васілю Тышкевічу. З гэтага часу ўсе нашчадкі беларускай галіны Тышкевічаў мелі графскі тытул, у тым ліку і Канстанцін Піевіч Тышкевіч, які ў свой час атрымаў добрую адукацыю ў Забельскім і Полацкім калегіумах, а затым у Віленскім універсітэце. Пазней ён апантана займаўся разам з братам Яўстафіем археалагічнымі і гістарычнымі даследаваннямі. Артэфакты, знойдзеныя падчас раскопак гарадішчаў, замчышчаў і курганоў і краязнаўчай дзейнасці, сталі асновай першага публічнага музея ў радавым маёнтку Лагойску [6].

Падабалася Канстанціну і Налібокская пушча, якую ў XVI ст. у польскага караля выкупіў князь Мікалай Радзівіл (Чорны) (1515–1565), вядомы як дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). Пэўны час ён займаў пасады канцлера ВКЛ (1550) і ваяводы віленскага (1551). У 1547 г. атрымаў тытул князя Свяшчэннай Рымскай імперыі «на Алыцы і Нясвіжы» [4]. У 1550-х гг. узначальваў, такую рэфармацыйную радыкальную плынь, як кальвінізм, і на беларускіх землях адчыняў малітоўныя дамы і школы. У Брэсце і Нясвіжы ім заснаваны друкарні. Дарэчы, пры яго садзенічанні надрукавана вядомая Берасцейская біблія.

Пазней у выніку шлюбных стасункаў нашчадкаў Мікалая Радзівіла (меў 4 дачок і 6 сыноў) з Тышкевічамі знакамітая Налібокская пушча перайшла да прадстаўнікоў роду Тышкевічаў, адным з якіх з’яўляўся граф Канстанцін. Яму падабаліся векавыя хвоі і дубы, на якіх мясцовыя бортнікі размяшчалі па некалькі калод-вулляў. З замілаваннем граф сузіраў усыпаныя лекавым разнатраўем лясныя паляны, якія перамежваліся то з лесам, то з непраходнай багнай. Пушча была населена незлічонай колькасцю птушак, дробнымі і буйнымі драпежнымі звярамі. Як аматару палявання графу было тут раздолле. Таму на ўскрайку пушчы размясцілася ўтульная графская сядзіба,

у якой ён падоўгу бавіў вольны ад навуковай і грамадскай дзейнасці час.

Славілася пушча табунамі дзікіх тарпанавідных коней, якім спадабаліся прасторы лесу. Назіраць Канстанціну Піевічу за імі было неверагодна цікава, асабліва калі падчас шлюбнага перыяду адбываліся даволі жорсткія змаганні за права ўзначаліць «гарэм», бо тарпаны ў пушчы жылі невялікімі групамі. Дарэчы, апошні дзікі тарапан быў забіты ў 1879 г. Сёння папуляцыя тарпанаў у Налібокскім ландшафтным заказніку адноўлена, табун налічвае звыш 300 адзінак [2].

У 1830 г. паўстанне напаткала К. Тышкевіча падчас знаходжання ў пушчы. Паўстанцы абаранялі ўздоўж рэк Заходняй Бярэзіны і Усы значную тэрыторыю, якая лічылася ў той час глухой і неабжытай мясцінай Налібокскай пушчы. Густыя лясы і непраходныя балоты былі надзейным сховішчам для паўстанцаў. Яны добра ведалі патаемныя сцежкі пушчы і ўмела манеўравалі, нечакана нападалі на царскае войска, а потым хутка знікалі. Граф Канстанцін непасрэдна не ўдзельнічаў у ваенных дзеяннях, але забяспечваў паўстанцаў зброяй і грашыма.

Асоба графа паступова міфалагізавалася насельніцтвам навакольных вёсак, дарэчы, як і здаўна пушча. Згодна паданням у ёй уладарылі лютыя язычніцкія асілкі, якіх асцерагаліся нават князі ВКЛ, якія ахрысцілі агнём і мячом усе беларускія землі. Гэтыя волаты займаліся паляваннем, зборам дзікага мёду, які быў вядомы далёка за межамі пушчы. Хадзілі легенды аб валхвах, якія здзяйснялі ў глыбіні лесу язычніцкія рэлігійныя абрады, прадказвалі будычыню, лячылі жыхароў пушчы, а яшчэ тут былі пярэваратні. У адпаведнасці з паданнямі з іх ліку Мікалай Радзівіл набіраў ваяроў у сваю ўзброеную «армію», а граф Канстанцін фарміраваў з іх сваіх целаахоўнікаў, якія былі як на падбор велізарнага росту і вельмі змрочныя.

З даўняга часу сярод жыхароў навакольных вёсак шырока распаўсюджана паданне аб адным беларускім магнаце, які з сынам асмеліўся заначаваць у сядзібе графа. Сыну магната спадабалася дачка графа, і малады прыхільнік амураў вырашыў ноччу заляцацца да пушчанскай прыгажуні. Падкраўшыся да яе акна, ён спрабаваў адчыніць яго і пракрасціся ў пакой да спячай дзяўчыны. Раптам хлопец заўважыў страшэнных граф-

скіх ахоўнікаў і спрабаваў уцячы ад іх, але тыя абярнуліся велізарнымі ваўкамі і насціглі гаротніка. Раніцай было знойдзена разарванае цела маладога чалавека [1].

Безумоўна, міфалагізавалася і асоба графа. Аб ім хадзілі розныя легенды. Так, жыхары навакольных вёсак успрымалі графа як калдуна, варажбіта, які валодаў мноствам таямніц. Напрыклад, ад Радзівілаў да яго перайшоў сакрэт прыручэння налібокскіх пярэваратняў, якія былі жудаснай і непераможнай аховай пушчы і графскай сядзібы.

Шэраг паданняў узнікаў падчас паўстання і яго падаўлення царскімі ўладамі, якім стала вядома аб актыўнай падтрымцы паўстанцаў графам Канстанцінам. Па загаду Мікалая I у Налібокі, ахопленыя паўстаннем, прыбыў з войскам флігель-ад'ютант Уладзімір Даўгарукаў. Было вырашана асабіста зрабіць нечаканы налёт на сядзібу Тышкевіча, каб захапіць кіраўнікоў паўстання, якія маўляў ператварылі сядзібу ў цэнтр кіравання змаганнем. Па паданні атрад карнікаў знік у пушчы без слядоў. Тое ж адбылося з узброеным канвоем, які суправаджаў павозкі з часткай арыштаваных паўстанцаў. Усе ахоўнікі былі разарваны невядомымі дзікімі жывёламі, пры гэтым коні, упрэжаныя ў карэты, засталіся жывымі. Налёты адбыліся і на паштовыя карэты, суправаждаемыя для аховы салдатамі, якія такім жа чынам былі разарваны, а вялікія грашовыя сумы ў золаце і пошта ўкрадзены.

Падчас нападзення на чарговы паштовы экспрэс выжыць удалося сяржанту Шуйскага пяхотнага палка, які паспеў схавацца пад карэту. Пазней ён распавядаў, што на ваенны канвой напалі вялікія зверы, падобныя на ваўкоў, адзін з іх адгрыз яму руку па локаць і імкнуўся дабрацца да горла. Кулі іх не бралі, а толькі вырывалі шматкі шэрсці, а раны адразу загойваліся.

У. Даўгарукаў кінуў на прачосванне пушчы велізарныя вайсковыя сілы, але ўсё было дарэмна. Таксама абшукалі графскую сядзібу, але там нікога не было акрамя невялічкай колькасці прыслугі і нямоглага ксяндза, які, пераконваў кіраўніка царскага войска, што на салдат нападаюць не паўстанцы і ваўкі, а сапраўдныя пярэваратні, якіх напачатку паўстання граф выпусціў у пушчу, загадаўшы не нападаць на паўстанцаў, а толькі на карнікаў. Калі паўстанне было падаўлена, нападзенні спыніліся.

Міфалагізавалі і іншых прадстаўнікоў славутага княскага роду. Легенды і паданні аб іх у многім абумоўлены іх археалагічнай дзейнасцю, асабліва раскопкамі старажытных курганаў. У народнай свядомасці лічылася вялікім кашчунствам разбураць магілы продкаў. Толькі на Лагойшчыне К. Тышкевічам раскапана больш за 200 курганоў і гарадзішчаў. Сяляне не за якія выгоды не пагаджаліся аказваць Тышкевічам дапамогу ў археалагічных даследаваннях. Аб гэтым К. Тышкевіч пісаў: «Народ наш настолькі абыякавы, лянівы або скрытны – не ведаю сам – што трэба яго доўга вывучаць, узмоцнена прасіць і добра частаваць, каб здабыць з яго вуснаў інфармацыю пра мінулае» [5, с. 68]. Легенды аб пярэваратнях нараджаліся і таму, што нярэдка графы Тышкевічы, перапрануўшыся ў простае сялянскае адзенне, хадзілі па вясковых хатах, каб паслухаць і запісаць народныя паданні, песні, паўдзельнічаць у традыцыйных абрадах і святах.

1. Гаврилуте, А. Кошмар Налибокской пущи / А. Гаврилуте // Русская история. – 2025. – № 10. – С. 29.

2. Дикие и любопытные // Аргументы и факты. – 2025. – № 52. – С. 17.

3. Грыцкевіч, А. Паўстанне 1830–1831 / А. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Бел. Энцыкл. ; рэдкал.: М. В. Біч [і інш.] ; прадмова М. Ткачова ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 1993–2003. – Т. 5 : М–Пуд / Бел. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – 1999. – С. 447–448.

4. Радзівіл Мікалай (мянушка Чорны) // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6. / Бел. Энцыкл. ; рэдкал.: М. В. Біч [і інш.] ; прадмова М. Ткачова ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 1993–2003. – Т. 6. Кн. 1 : Пузыны – Усая / Бел. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – 2001. – С. 58–59.

5. Рамандзіна, Д. В. Канстанцін Тышкевіч як этнограф (на матэрыялах кнігі «Вілія і яе берагі») / Д. В. Рамандзіна // II Тышкевіцкія чытанні, Лагойск, 15 кастр. 2009 г. : матэрыялы чытанняў / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2009. – С. 66–70.

6. Смолік, А. І. Краязнаўчая дзейнасць Яўстафія і Канстанціна Тышкевічаў / А. І. Смолік // II Тышкевіцкія чытанні, Лагойск, 15 кастр. 2009 г. : матэрыялы чытанняў / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2009. – С. 70–75.

7. Элиаде, М. Мифы, сновидения, мистерии = Myths, dreams and mysteries / М. Элиаде ; пер. с англ. А. П. Хомик. – М. : Рефл-Бук ; Киев : Ваклер, 1996. – 285 с.

А. А. Суша,
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Мінск

ПРАЦЫ «АПІСАННЕ БАРЫСАЎСКАГА ПАВЕТА» ЯЎСТАХА ТЫШКЕВІЧА І «ВІЛІЯ І ЯЕ БЕРАГІ» КАНСТАНЦІНА ТЫШКЕВІЧА ЯК КРЫНІЦЫ ФАРМІРАВАННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ І РЭГІЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Для разумення беларускай культуры XIX ст. працы «Апісанне Барысаўскага павета» Яўстаха Тышкевіча і «Вілія і яе берагі» Канстанціна Тышкевіча маюць значэнне не толькі як эмпірычныя крыніцы па гісторыі, этнаграфіі і археалогіі. Яны выступаюць тэкстамі культурнай памяці: фіксуюць мясціны, паданні, абрады, мову, песні, гаспадарчыя практыкі і матэрыяльныя рэшткі мінулага, праз якія рэгіянальная супольнасць пачынае ўсведамляць сябе ў гістарычным кантынууме. У тэрмінах даследаванняў памяці гэта пераход ад камунікатыўнай памяці, што жыве ў аповедах і сямейна-грамадскіх практыках, да культурнай памяці, замацаванай у пісьме, кнізе, карце, музеі і сімвалічных месцах [4, p. 110–111; 5, p. 7–8].

Мэта артыкула – паказаць, што абедзве названыя працы не зводзяцца да краязнаўчага апісання ў вузкім сэнсе. Яны стварылі інтэлектуальную мадэль «свайго краю», у якой настальгія па «даўніне», мінулых часах Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) і Рэчы Паспалітай спалучалася з пошукам новай культурнай саматоеснасці ў грамадска-палітычных рэаліях XIX ст. Тышкевічы яшчэ не фармулявалі сучаснай беларускай нацыянальнай ідэі, але іх тэксты збіралі і ўпарадкоўвалі той матэрыял, без якога немагчымым стала пазнейшае ўтварэнне беларускай нацыі: памяць пра зямлю, мову, звычаі, народную паэзію, старажытныя помнікі і лакальныя традыцыі.

Першая палова XIX ст. была часам, калі вывучэнне беларускіх зямель знаходзілася паміж рамантычным антыкварствам,